**ВОДЗЫЎ**
**на аўтарэферат дысертацыі**
**Шаўчэнка Яны Сяргееўны**
**"Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў**
**(канец XIX – пачатак XXI ст.)",**
**прадстаўленай на саісканне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія**

Актуальнасць дысертацыі Я. С. Шаўчэнка абумоўлена неабходнасцю павышэння экалагічнай самасвядомасці беларусаў, вяртання да традыцый рацыянальнага прыродакарыстання, што з'яўляецца важнай састаўной часткай жыцця сучаснага грамадства.

У дадзеным даследаванні ўпершыню ў айчыннай этналогіі прадстаўлены комплексны аналіз назапашанага этналагічнага, фальклорнага, лінгвістычнага і інш. матэрыялаў па народных ведах пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст. У выніку праведзенага даследавання былі выяўлены асноўныя заканамернасці развіцця народных ведаў беларусаў пра дзікарослыя расліны канца XIX – пачатку XXI ст.; ахарактарызаваны асноўныя аспекты выкарыстання дзікарослых раслін у матэрыяльнай культуры беларусаў канца XIX – пачатку XXI ст.; вызначана роля дзікарослых раслін у духоўнай культуры беларусаў азначанага перыяду; выяўлена значэнне ведаў і практычных навыкаў пра дзікарослыя расліны ў сучасным паўсядзённым жыцці насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Структура дысертацыі характарызуецца сваёй прадуманасцю і лагічнасцю, а яе састаўныя часткі накіраваны на паспяховае вырашэнне пастаўленых мэты і задач.

Даследаванне Яны Сяргееўны мае практычную і навуковую значнасць. Практычная значнасць даследавання заключаецца ў выкарыстанні яго вынікаў у праграмах і лекцыйных курсах для студэнтаў ВНУ, краязнаўстве, турыстычнай сферы, дзейнасці музеяў прыродазнаўчага профілю нашай краіны. Навуковая вартасць заключаецца ў выкарыстанні вынікаў даследавання пры падрыхтоўцы абагульняючых манаграфій і напісанні навуковых артыкулаў па экалагічных ведах беларусаў, распрацоўцы агульных курсаў па культуры жыццезабеспячэння і па многіх дысцыплінах спецыялізацыі на першай і другой ступені падрыхтоўкі спецыялістаў гуманітарнага профілю у ВНУ Рэспублікі Беларусь.

Дысертацыя Я. С. Шаўчэнка "Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)" з'яўляецца даследаваннем, якое па новаму дазваляе ўспрымаць ролю гэтай часткі культуры ў паўсядзённым і святочна-абрадавам жыцці беларускага этнаса на працягу розных яго гістарычных этапаў. Асабліва важным з'яўляецца ўвод у

навуковых зварот у дысертацыі новага палявога этнаграфічнага матэрыялу, сабранага аўтарам у розных гісторыка-этнаграфічных рэгіёнах Беларусі.

Вынікі даследавання адлюстраваны ў 21 публікацыі аўтара (7 з іх навуковыя артыкулы, уключаныя ў спіс навуковых выданняў Рэспублікі Беларусь для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў; 13 – публікацыі ў зборніках навуковых артыкулаў; 9 – матэрыялы навуковых канферэнцый; 1 – кніжнае навукова-папулярнае выданне).

Прадстаўлены аўтарэферат сведчыць аб тым, што дысертацыя Я. С. Шаўчэнка “Народныя веды пра дзікарослыя расліны ў традыцыях беларусаў (канец XIX – пачатак XXI ст.)” выканана адпаведна ўсім патрабаванням ВАК. Шаўчэнка Я.С. безумоўна заслугоўвае прысуджэння вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія.

Загадчык кафедры этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта,
доктар гістарычных навук, прафесар Т.А. Навагродскі

ПОДПИСЬ Навагродски Т.А. УДОСТОВЕРЯЮ
Начальник управления организационной работы и документационного обеспечения
Н.Б. Черкасская
«07» 12 2023

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ
РЭСПУБЛІКА БЕЛАРУСЬ